# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА В. М. АРЛОЎСКАГА



**В.  М. Арлоўскі, кіраўнік групы**

**Перыяд дзеяння:**

вясна 1942 г. – сакавік 1944 г.

**Месца дзеяння:**

аэрадром г. Віцебска

**Колькасць:**

15 чалавек

**Кіраўнікі:**

Арлоўскі Васіль Мікалаевіч («Джон», «Арлёнак»)

Дзейнічала на варожым аэрадроме ў Віцебску з вясны 1942 г. да сакавіка 1944 г. Аб’ядноўвала 15 чалавек. Кіраўнік В. М. Арлоўскі («Джон», «Арлёнак»). У групу ўваходзілі яго бацька Мікалай Кірылавіч, маці Ганна Аляксееўна, брат Генадзь і сястра Людміла, Н. І. Багданава, У. Ц. Жызнеўскі, М. С. Ліцкала (Кудрашова), К. С. Максімава (Пракапчук), І. Міхненкаў («Дзядзя Ваня»), К. Ф. Неглін, Е. Самцова, А. І. Франтова, М. С. Хаванская, М. П. Шаўроў. Працавала ва ўзаемадзеянні з іншымі падпольнымі групамі.

У 1942 г. цераз сувязных М. А. Жыдовіч і Д. І. Кузьміну была ўстаноўлена сувязь з разведгрупай П. В. Буткевіча і партызанскай брыгадай «Аляксея» (А. Ф. Данукалава), у 1943 г. І. А. Бекішаў і В. С. Кулагіна звязалі Арлоўскага з Буеўскім партызанскім атрадам і Віцебскім падпольным гаркамам КП(б)Б. Падпольшчыкі сачылі за перасоўваннем войск па Смаленскай і Аршанскай шашы, у 1942 г. перадалі групе Буткевіча план Віцебска з апісаннем аб’ектаў на левым беразе Заходняй Дзвіны, абясшкодзілі 5 агентаў абвера.

Працуючы качагарам на аэрадроме, В. М. Арлоўскі здзейсніў узрыў у клубе лётчыкаў, замініраваў падыходы да бомбасховішча, 2 бронетранспарцёры, разам з братам і Бекішавым замініравалі 2 самалёты, адзін з якіх узарваўся над в. Шавардзіно, другі не вярнуўся на аэрадром. Генадзь узарваў насосную частку вадакачкі. Міны і ўзрыўчатку дастаўлялі сувязныя Жыдовіч, Шаўроў і інш. Ліцкала, Неглін, Міхненка вялі разведку, Франтова і Багданава распаўсюджвалі лістоўкі, Хаванская здабывала медыкаменты для партызан. Падпольшчыкі вывелі да партызан 14 чалавек з в. Лятохі. Пяцёра падпольшчыкаў з групы Арлоўскага дзейнічалі ў горадзе да сакавіка 1944 г., потым усе яны былі вывезены ў Германію.

Кіраўнік групы В. М. Арлоўскі ўзнагароджаны медалём «За адвагу».

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група В. М. Арлоўскага / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 479–480.

2. **Подпольная** группа Орловского В. Н. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 294.